УДК 130.2(4760):001.891"2015/2025

# ПАНАРАМА ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКІХ КУЛЬТУРОЛАГАЎ У 2015–2025 ГГ.

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Аналізуецца развіццё навукова-даследчай дзейнасці навукоўцаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» у сферы духоўнай і матэрыяльнай культуры ў 2015–2025 гг. Паказваецца, што іх праблемнае поле не толькі пашырылася, але і значна паглыбілася. Даследаванні культуролагаў ахопліваюць аспекты: ад марфалагічнай тыпалагізацыі культур да іх творчага шматгалосся. Акрэслены перыяд характарызуецца як этап далейшага развіцця айчыннай культуралогіі.

**Ключавыя словы:** культуралогія, навуковыя даследаванні, апошняе дзесяцігоддзе, універсітэт.

# A PANORAMA OF RESEARCH BY BELARUSIAN CULTURAL SCIENTISTS IN 2015–2025

***A. Smolik,***
*Doctor of Cultural Studies, Professor, Head of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article analyzes the development of scientific research activities of university scientists in the field of spiritual and material culture in 2015–2025. It is indicated that their problem field has not only expanded, but also significantly deepened. The research of cultural scientists covers aspects ranging from the morphological typologization of cultures to their creative polyphony. This period is characterized as a stage in the further development of Russian cultural studies.

**Keywords:** cultural studies, scientific research, the last decade, university.

Культура ў наш час разглядаецца як складаная, шматгранная, дынамічная сацыяльная з'ява, якая ўзнікла ў выніку творчых здольнасцей чалавека, яго духоўнага свету. Такое ўспрыняцце культуры як цэласнай з'явы абумовіла фарміраванне інтэгральнай галіны гуманітарных ведаў – культуралогіі, якая вывучае розныя віды культурнай творчасці, іх функцыянаванне і развіццё ў сацыяльных сістэмах.

Культуролагі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» на працягу апошняга дзесяцігоддзя займаюцца даследаваннем розных аспектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры не толькі беларусаў, але і іншых народаў і цывілізацый. Праблемнае поле навуковых пошукаў у гэты перыяд не толькі значна пашырылася, але і паглыбілася. Выкарыстоўваючы розныя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы і канцэпцыі, навукоўцамі культуралагічнай школы ўніверсітэта даследуюцца розныя аспекты: ад марфалагічнай тыпалагізацыі культур да іх творчага шматгалосся.

Ва ўмовах самастойнага развіцця нацыянальнай культуры актуалізавалася гістарычная памяць беларускага народа, якая выступае індыкатарам і рухаючай сілай развіцця сучаснага беларускага грамадства. У такім кантэксце даследаванне праблемы беларусаў з'яўлялася адным з важных кірункаў навукова-даследчай дзейнасці культуролагаў Беларусі як у тэарэтыка-метадалагічным, так і ў практычным аспектах. Так, станаўленне культуры інфармацыйнага грамадства Беларусі на рубяжы XIX–XX стст. прааналізавана С. М. Сарокай. На аснове сучасных навуковых канцэпцый аб інфармацыі і інфармацыйных працэсах сацыякультурнай дынамікі ёй сфарміравана ўласнае архітэктанічнае адзінства інфармацыйнай прасторы беларускай культуры абазначанага перыяду [13]. У працэсе даследавання С. М. Сарокай устаноўлена, што аўтагенезу беларускай культуры ў гэты адрэзак часу садзейнічала распаўсюджанне нацыянальнай ідэі як культурнага кода на афіцыйным і неафіцыйным узроўнях. Беларуская ідэя, па яе меркаванні, выступала ў якасці інфармацыйнага пульсара.

Поліпарадыгмальнасці як адметнасці сацыядынамікі беларускай культуры XIX – першай паловы XX ст. прысвечаны даследаванні У. А. Жылко [5]. Структурнымі элементамі поліпарадыгмальнасці беларускай духоўнай культуры ў гэты час, на яе погляд, з'ўляліся рэфлексійныя аксіялагемы і ідэалы. У якасці носьбітаў найвышэйшай каштоўнасці выступалі такія ідэалы, як

ідэал сацыяльнай і этнічнай кансалідацыі грамадства, ідэал праўды, ідэал свабоды, ідэал сацыяльнай роўнасці, ідэал мінулага і інш.

На аснове сістэмнага аналізу квантыфікуемых і неквантыфікуемых фактараў культуролагам Ю. І. Кнацько выяўлены асаблівасці трансфармацыі сучаснай беларускай культуры, якая, на яе погляд, прадстаўляе поліфактарны працэс пераўтварэння, які закранае асноўныя сферы культуратворчасці. Функцыянуючы ў цесным узаемадзеянні, квантыфікуемыя фактары адлюстроўваюць пераважна колькасныя паказчыкі трансфармацыі культуры, а неквантыфікуемыя фактары выступаюць у якасці асобага патэнцыялу як якасныя фактары змястоўнага пераўтварэння ўсёй сістэмы культуры [7].

Комплекснае культуралагічнае даследаванне сацыядынамікі сацыякультурных інстытутаў віртуальнай культурнай прасторы Рэспублікі Беларусь ажыццёўлена А. В. Худніцкай. Ёй вызначаны дэтэрміннанты інстытуялізацыі віртуальнай культурнай прасторы з улікам асноўных уласцівасцей і кірункаў яе развіцця [18]. Асаблівай вартасцю даследавання з’яўляецца выяўленне спосабаў эфектыўнай арганізацыі дзейнасці падобных структур у віртуальнай культурнай прасторы Беларусі.

Важным кірункам культуралагічных даследаванняў пазначанага дзесяцігоддзя з’яўляецца захаванне і рэвіталізацыя культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, бо гістарычныя вобразы ўплываюць на фарміраванне светапогляду, ідэалаў, каштоўнасцей суб’ектаў культуры. Дадзеную праблему на працягу шэрагу гадоў плённа распрацоўвае культуролаг В. М. Сакалова. У фундаментальных манаграфіях навуковец раскрывае шэраг амаль недаследаваных аспектаў камемаратыўнай культуры: пытанні ўзаемадносін грамадства з памяццю, якая ўтрымліваецца ў помніках; праблемы ўспрыняцця і выкарыстання культурнай прасторы, якую ўтвараюць помнікі і сабе падначальваюць; уплыў сучасных камемаратыўных практык на мадэрнізацыю культурна-гістарычнай прасторы Рэспублікі Беларусь і інш. [15]. Найбольш выразна, сцвярджае культуролаг, культурныя сэнсы гістарычных вобразаў праяўляюцца ў гісторыі і традыцыях беларускіх гарадоў. На іх аснове ажыццяўляецца культурная ідэнтыфікацыя, аб’ектывуецца нацыянальная ідэя. В. М. Сакаловай выяўлены прынцыпы фарміравання вобразаў мінулага. На яе погляд, іх фарміраванне адбываецца ў адпаведнасці з прынцыпамі гістарызму, ідэалагічнай абгрунтаванасці,

уліку канфесійнай прыналежнасці, ідэнтыфікацыі. Немалаважную ролю, як сцвярджае даследчыца, адыгрываюць таксама маральныя, эстэтычныя і этычныя прынцыпы.

Геакультурны патэнцыял беларускіх гарадоў у кантэксце інтэграцыйных працэсаў з’яўляецца аб’ектам даследавання культуролага А. Г. Кавалені [8]. Неабходнасць яго даследавання, па меркаванні культуролага, дэтэрмініравана рызыкай стандартызацыі, уніфікацыі і страты ўнікальнай культурнай ідэнтычнасці пад уплывам транснацыяналізацыі. Умацаванне геакультурнага патэнцыялу спрыяе ўстойліваму сацыякультурнаму развіццю Рэспублікі Беларусь, фарміраванню пазітыўнага іміджу беларускай культуры ў сусветнай супольнасці.

Асаблівасці інтэлектуальнай культуры Вялікага Княства Літоўскага прааналізаваны В. Д. Міхайлавым. Даследчыкам паказана, што інтэлектуальная культура Вялікага Княства Літоўскага насіла інтэгратыўны характар, упісвалася ў агульнаеўрапейскі і ўсходнеславянскі кантэксты. У ёй адбываўся сінтэз светапоглядных установак еўрапейскага рацыяналізму і хрысціянскага тэізму, а таксама элементаў дахрысціянскай культурнай спадчыны [11].

Дэтэрмінанты актуалізацыі культурна-гістарычнай спадчыны разгледжаны ў кантэксце дзейнасці ўстаноў музейнага тыпу ў дысертацыях І. І. Бамбешка [1], Ван Дань [3], С. В. Гаўрылавай [4], К. Г. Плытнік [12], С. Л. Шпарло [20].

Феномен часу ў міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў прааналізаваны А. В. Катовіч. Даследчыца прыйшла да высновы, што ў міфалогіі беларусаў існуе шэраг форм часу, кожная з якіх праяўляецца ў адпаведных кантэкстах і выконвае пэўную абрадавую функцыю. Дамінантнымі з іх з’яўляліся кампенсаторная (рэверсіўны час), рэгенератыўная (абрад навалецця), «перазапуску» календара (кампрэсія часу), працэсуальнай трансфармацыі (парогавы час) і інш. [6].

Параўнальна-тыпалагічнае даследаванне багатай міфалагічнай спадчыны беларускага этнасу ажыццёўлена Лю Янь. У працэсе работы ёй выяўлены і тэарэтычна абгрунтаваны асаблівасці міфалогіі беларусаў. На яе погляд, беларуская міфалогія характарызуецца двухслойнасцю: старажытнабеларускім (паганскім і політэістычным) і хрысціянскім кампанентамі. Пад уплывам пэўных культурна-гістарычных фактараў міфалогія беларусаў не аформілася ў адзіную сістэму міфаў і вераванняў і ў далейшым увасобілася ў казачнай творчасці [9].

У полі зроку такіх беларускіх культуролагаў, як К. Г. Машарскі [10], І. І. Таркан [16], М. А. Татарэвіч [17], Ю. А. Яроцкая [21], былі праблемы ўзаемадзеяння культур і ўзаемапранікнення элементаў заходніх і ўсходніх цывілізацый, якія інтэнсіфікаваліся пад уплывам глабалізацыйных працэсаў. Імі глыбока і ўсебакова даследаваны сацыякультурныя дэтэрмінанты, якія, нягледзячы на шэраг культурных, грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных адрозненняў, абумовілі інтэнсіфікацыю дыялогу беларускай культуры з культурамі Індыі, Карэі, Кітая, Японіі і іншых краін Усходу.

Абагульненне гісторыі развіцця даследаванняў моладзевых субкультурных фаміраванняў здзейснены Г. В. Бугаенка [2], В. Л. Гуцько, Л. К. Кухто [14], Чжаа Цзенфан, Чжаа Шэншань [19].

Такім чынам, мінулае дзесяцігоддзе можна ахарактарызаваць як перыяд далейшага развіцця айчыннай культуралогіі. За гэты час ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя культуры» абаранілі 25 маладых даследчыкаў Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі. Створана трывалае вучэбна-метадычнае забеспячэнне засваення асноў фундаментальнай і прыкладной культуралогіі. Сказанае вышэй дазваляе канстатаваць, што сучасны стан беларускай навукі аб культуры ва ўніверсітэце ў асноўным станоўчы, хаця на шляху яе развіцця існуе і шэраг складанасцей, якія пэўным чынам стрымліваюць яе дынаміку.


1. *Бамбешка, І. І.* Генезіс культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі / І. І. Бамбешка // Искусство и культура. – 2020. – № 2. – С. 67–71.

2. *Бугаенко, А. В.* Молодежь как социокультурная общность / А. В. Бугаенко // Вестник Полоцкого государственного университета. – 2020. – № 7. – С. 116–119.

3. *Ван Дань.* Нематериальное культурное наследие: опыт сохранения и ревитализации в учреждениях образования Беларуси / Ван Дань // Весці БДПУ. Серыя 2 : Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2020. – № 2. – С. 129–132.

4. *Гаўрылава, С. В.* Музейная экспазіцыя як інтэрпрэтацыйная мадэль гістарычнай рэчаіснасці / С. В. Гаўрылава // Искусство и культура. – 2019. – № 2 (34). – С. 71–76.

5. *Жылко, У. А.* Парадыгмы сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства першай паловы XIX ст. / У. А. Жылко // Искусство и культура. – 2013. – Вып. 2 (10). – С. 97–108.

6. *Катовіч, А. В.* Каляндарныя абрады навалецця – згорнутая мадэль міфалагічнага часу / А. В. Катовіч // Роднае слова. – 2020. – № 2. – С. 78–82.

7. *Кнатько, Ю. И.* Неквантифицируемые факторы трансформации современной белорусской культуры: специфика типологизации и функционирования / Ю. И. Кнатько // Вести Института современных знаний. – 2016. – № 3. – С. 70–75.

8. *Коваленя, Е. Г.* Геокультурный потенциал города: сущность, структура и факторы формирования / Е. Г. Коваленя // Вести Института современных знаний. – 2017. – № 3. – С. 82–87.

9. *Лю Янь.* Персонаж белорусской и китайской мифологии как первотворец артефактов культуры: сравнительно-типологический аспект / Лю Янь. – Минск : А. Н. Вараксин, 2018. – 256 с.

10. *Машарский, К. Г.* Анализ социокультурных оснований модернизационных процессов в Корее / К. Г. Машарский // Вести Института современных знаний. – 2018. – № 3. – С. 106–111.

11. *Михайлов, В. Д.* Интеллектуальная культура ВКЛ: определение и особенности / В. Д. Михайлов // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2019. – № 1 (31). – С. 70–76.

12. *Плытник, Е. Г.* К вопросу о взаимодействии музея и местного сообщества / Е. Г. Плытник // Искусство и культура. – 2018. – № 2 (36). – С. 67–71.

13. *Сарока, С. М.* Архітэктоніка інфармацыйнай прасторы беларускай культуры XIX – пач. XX ст. : манагр. / С. М. Сарока. – 2-е выд., са змян. і дап. – Наваполацк : ПДУ, 2016. – 291 с.

14. *Смолик, А. И.* Субкультурные молодежные формирования XXI века : учеб. пособие / А. И. Смолик, Л. К. Кухто, О. Л. Гутько. – Минск : РИВШ, 2022. – 196 с. : ил.

15. *Соколова, О. М.* Коммеморация в городском пространстве: город как место культурно-исторической памяти / О. М. Соколова ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2022. – 490 с.

16. *Таркан, И. И.* Рецепция индийской культуры в западной интеллектуальной традиции / И. И. Таркан // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2020. – № 2. – С. 47–56.

17. *Татарэвіч, М. А.* Культурна-гістарычны кантэкст адаптацыі мусульман на беларускіх землях / М. А. Татарэвіч // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2018. – № 2. – С. 63–70.

*18. Худніцкая, А. В.* Віртуальная культурная прастора ў сучасным навуковым дыскурсе / А. В. Худніцкая // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия Е, Педагогические науки. – 2017. – № 7. – С. 188–192.

*19. Чжао Цзенфан.* Субкультура поколения Китая: предпочтения и интересы / Чжао Цзенфан, Чжао Шэншань, А. И. Смолик ; науч. ред. Л. К. Кухто. – Минск : РИВШ, 2022. – 232 с.

*20. Шпарло, С. Л.* Историко-культурное наследие: эволюция дефиниции и содержания / С. Л. Шпарло // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2020. – № 1 (35). – С. 182–188.

*21. Яроцкая, Ю. А.* Интерференция христианства в культуру Японии / Ю. А. Яроцкая ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2019. – 154 с.